самым активно влиять на восприятие зрителя. Точный и яркий музыкальный образ всегда помогает действию. Даже если музыка – всего лишь фон, она должна выполнить это свое скромное, но необходимое по отношению ко всем остальным компонентам назначение [4, с. 3].

Музыкальная композиция дает возможность не только заострить характеристики героев, но и эмоционально скрасить происходящее на сцене. В зримой песне, как и говорилось выше, музыка занимает основную роль, так как актер раскрывает сюжет песни при помощи своих ассоциаций.

## СПИСОК ИСПОЛЬЗОВАННЫХ ИСТОЧНИКОВ:

1. Зримая песня [Электронный ресурс] / 2009. – Режим доступа: https://www.liveinternet.ru/community/2388150/post107719441/.html. – Дата доступа: 28.03.2020.

2. Кузьмин, В.В. Зримая песня. Учебно-методическая рекомендация [Электронный ресурс] / СПбГИК. – СПб., 2017. – Режим доступа: http://www.spbgik.ru/upload/file/kaf/fie/crpm/publ/07_kaf_raie_metod_vv_kuzmin_zrim_pes.pdf. – Дата доступа: 09.03.2020.

3. Литературно-музыкальная композиция как вид театрализованного представления [Электронный ресурс]. – 2016. – Режим доступа: https://studfile.net/preview/2781860/page:4/.html. – Дата доступа: 27.03.2020.

4. Звукорежиссура спектакля [Электронный ресурс] / 2011. – Режим доступа: http://www.tabik.ru/?p=3379. – Дата доступа: 12.03.2020.

5. Музыкальная композиция [Электронный ресурс] / 2018. – Режим доступа: https://domifa.ru/rubriki/terminy/134-muzykalnaya-kompozitsiya.html. – Дата доступа: 28.03.2020.

Бурко П. А., БГУКИ, студент 402 группы
очной формы обучения
Научный руководитель – Бабко А. И.,
кандидат философских наук, доцент

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ПРАВА НА СУІЦЫД ЯК ПРАДМЕТ ФІЛАСОФСКАЙ РЭФЛЕКСІІ

Ці ёсць у чалавека права на суіцыд? Доўгія гады, пад ціскам хрысціянства, тэма суіцыду была практычна пад забаронай у еўрапейскай культуры, а здзяйсненне самагубства з'яўлялася смяротным грахом. Найпросты маральны погляд на самагубства мяркуе, што яно абавязкова няправільна, таму што чалавечае жыццё святое [1].

Зараз жа свет мяняецца, і гэтая тэма пачынае закранаць многія сферы чалавечай дзейнасці: ад нашага штодзённага існавання да прыняцця палітычных рашэнняў. Чалавецтва паступова пачынае адыходзіць ад прынятых рэлігійных законаў, але пытанне «легальнасці» суіцыду ўсё так і застаецца пытаннем.

Самагубства было і ёсць багатай вобласцю філасофскіх даследаванняў. Так, яшчэ тры сотні гадоў таму шатландскі філосаф Дэвід Юм пачаў разглядаць тэму самазабойства, што відавочна апярэджвала культуру і ўяўленні таго часу. У эсэ «Пра самазабойства» Юм пісаў: «Пастараемся ж вярнуць людзям іх прыродную свабоду, разабраўшы ўсе звычайныя аргументы супраць самагубства і паказаўшы, што азначанае дзеянне свабодна ад усякай грахоўнасці і не падлягае якому-небудзь ганьбаванню ў адпаведнасці з меркаваннямі ўсіх старажытных філосафаў» [2, с. 698].

У працы шатландскага філосафа разглядаюцца аргументы супраць самагубства, уласцівыя XVIII стагоддзю – абавязак у дачыненні да Бога, да грамадства і да саміх сябе. Варта адзначыць кожны з іх.

*Суіцыд – гэта парушэнне абавязку ў дачыненні да Бога.* Цікава, што Юм ні ў якім разе не ставіў рэлігію пад сумнеў. У сваім эсэ ён, хутчэй, разглядаў ілжывыя ўяўленні чалавека пра Бога і аналізаваў уплыў прымхаў на штодзённае жыццё.

Тут варта адзначыць, што нават у сучасным свеце маюць месца выпадкі, калі на самазабойцу вешаюць ярлык злачынца, асабліва ў рэлігійных

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

супольнасцях. Маўляў, жыццё дадзена Богам і толькі ён яго і забірае. Але Дэвід Юм пісаў: «Усе падзеі ў вядомым сэнсе могуць быць названыя дзеяй Усемагутнага; усе яны вынікаюць з тых сіл, якімі ён надзяліў свае творы. Дом, які падае ў сілу ўласнага цяжару, не больш абавязаны сваім падзеннем яго провіду, чым дом, які руйнуецца стараннямі людзей; і чалавечыя здольнасці не ў меншай ступені справа яго рук, чым законы руху і прыцягнення» [2, с. 699].

Так, філосаф тлумачыў, што раз Усявышні кантралюе ўсе жыццёвыя працэсы, то ён кантралюе і нас, нашы думкі. Сюды можна аднесці і думкі пра суіцыд. Калі чалавек сапраўды хоча сябе забіць, то, можа, на тое воля Бога?

Годным увагі з‘яўляецца той факт, як Дэвід Юм апісаў розніцу паміж самагубствам і самазахаваннем: «Калі б распараджэнне чалавечым жыццём было ў такой меры пакінута за сабой Усемагутным у якасці справы, якая падлягае яго асабліваму вядзенню, што распараджацца сваім жыццём было б з боку людзей замахам на яго права, то было б аднолькава злачынна дзейнічаць як дзеля захавання жыцця, так і дзеля яго разбурэння. Калі я адхіляю камень, які падае на маю галаву, я парушаю ход прыроды і замахваюся на асаблівую вобласць дзеянняў Усемагутнага, падаўжаючы сваё жыццё за межы таго перыяду, які Ён наказаў на падставе агульных законаў матэрыі і руху» [2, с. 701].

То бок калі самазайбойства – гэта злачынства, таму што чалавек пайшоў супраць волі Бога, то і захаванне жыцця – злачынства, таму што ён зноў ідзе супраць волі Бога. Напрыклад, чалавек сур‘ёзна захварэў, ён лечыцца. Але ці так правільна лячыцца, калі хвароба, магчыма, была дадзена Богам, таму што ён вырашыў, што прыйшла тая самая гадзіна для індывідуума – гадзіна паміраць?

Што датычыцца *суіцыду як парушэнне абавязку ў дачыненні да грамадства*, то філосаф паставіў наступные пытанне ў сваім эсэ: «Я не абавязаны рабіць нязначнае дабро грамадству за кошт вялікай шкоды для сябе самога; чаму ж у такім выпадку варта мне працягваць жаласнае

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

існаванне з-за нейкай дробязнай выгады, якую грамадства магло б, мабыць, атрымаць ад мяне?» [2, с. 705].

Здаецца, у Сярэднявеччы, калі рэлігія мела вялікі ўплыў, прапаганда супраць суіцыду была актуальнай, бо вакол настолькі шмат смерцяў – ад голаду, розных хвароб, пажараў і простых забойстваў, – што самазабойства становіцца проста нявыгадным для гэтага самага грамадства. Калі вакол масавыя смерці, ды яшчэ і некаторыя самі сябе забіваюць, то хто тады застанецца? Хто будзе працаваць, будаваць будучыню?

У наш жа час актуальнасць такой «прапаганды» відавочна падае, бо якасць чалавечага жыцця толькі расце. Самагубства – з‘ява дастаткова рэдкая, як і проста ранняя смерць, таму навошта лічыць самазабойцу злачынцам? Колькасць людзей на планеце толькі расце, таму ў чым сэнс весці барацьбу з суіцыдам? Ні ў якім разе не маецца на ўвазе, што самазабойства – гэта добра, але і ні ў якім разе не дрэнна, бо ў прынцыпе адзін чалавек нікому нічога не абавязаны і наўрад ці яго смерць неяк кардынальна паўплывае на жыццёвыя працэсы.

Але што, калі такіх людзей шмат? Варта звярнуцца да яшчэ аднаго аргументу супраць самазабойства – *парушэнне абавязку ў дачыненні да саміх сябе*.

«Я ўпэўнены, што ніхто ніколі не адмаўляўся ад жыцця, пакуль яго варта захоўваць. Бо такі вялікі наш натуральны жах перад смерцю, што нязначныя матывы ніколі не будуць у сілах прымірыць нас з ёй» [2, с. 706], – напісаў шатландскі філосаф.

Так, Юм адхіляе тэзіс аб тым, што самагубства парушае наш абавязак перад самім сабой. Хвароба, старасць і падобнае могуць зрабіць жыццё настолькі няшчасным, што далейшае існаванне будзе горш смерці. Але нават пры такіх умовах чалавек не заўсёды вырашыцца здзейсніць самазабойства, бо баіцца смерці.

Такім чынам, вельмі спрэчна, што ў сапраўдных умовах жыцця з‘явіцца мноства людзей, якія вырашаць скончыць сваё жыццё самагубствам. Наўрад

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ці наяўнасць у грамадстве «права на суіцыд» пакажа камусьці, што самагубства можна даволі проста здзейсніць без наступстваў. Як і адсутнасць «ярлыкоў» на людзях, якія здзейснілі суіцыд, і іх сем‘ях ніяк не паспрыяе павелічэнню ліку самазабойстваў. Бо самае моцнае, што стаіць перад усімі намі, – гэта страх. Банальны, інстынктыўны страх перад смерцю.

Хочацца зрабіць выснову, што ў сучасным грамадстве варта весці барацьбу не з суіцыдам, а з недасведчаным стаўленнем да людзей, якія апынуліся ў цяжкім становішчы або якія маюць псіхічныя захворванні. Вядома, заўсёды прасцей навесіць ярлык, спрасціць сваё разважанне на дадзеную тэму з дапамогай тых ці іншых стэрэатыпаў, але ж мы жывем у свеце, калі чалавечае (і не толькі) жыццё становіцца нашай галоўнай каштоўнасцю, дык чаму б не даць чалавеку свабоду распараджэння ім, толькі дапамагаючы ў крытычнай сітуацыі?

СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ КРЫНІЦ:

1. Suicide [Electronic resource] // Stanford Encyclopedia of Philosophy. – Mode of access: https://plato.stanford.edu/entries/suicide/. – Date of access: 30.03.2020.
2. Юм, Д. О самоубийстве / Д. Юм // Сочинения : в 2 т. – М. : Мысль, 1996. – Т. 2. – С. 697–706.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Бутенко К. В., БГУКИ, студент 117 группы
очной формы обучения
Научный руководитель – Старикова В. В.,
кандидат искусствоведения, доцент

## ИНТЕРПРЕТАЦИИ КОНЦЕРТА №2 ДЛЯ ЦИМБАЛ С ОРКЕСТРОМ ДМИТРИЯ СМОЛЬСКОГО В ИСТОРИЧЕСКОМ АСПЕКТЕ